# Шлях да Скарыны

**Пад час святкавання XXIII Дня беларускага пісьменства у Рагачове пачаўся адлік апошняга году перад святкаваннем 500-годдзя беларускага кнігадрукавання**

Будучы юбілей будзе адзначацца шырока. Анансуючы яго, выступаючы адным з ініцыятараў падрыхтоўкі да свята, шэраг імпрэзаў ладзіла ў Рагачове Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

У прыватнасці, 4 верасня на пляцоўцы Фестывалю кнігі і прэсы прэзентавалася дзіцячая трохтомная энцыклапедыя “Францыск Скарына”. Гэта вынік сумеснай працы намесніка дырэктара НББ Алеся Сушы і выдавецтва “Беларуская энцыклапедыя імя П.  Броўкі”. Тры тамы энцыклапедыі падрыхтаваны на аснове найноўшых даследаванняў, багатага ілюстрацыйнага матэрыялу. Гэта аповед пра жыццёвы шлях і спадчына першадрукара. Кнігі “Францыск Скарына — чалавек-энцыклапедыя”, “Францыск Скарына — чалавек свету”, “Францыск Скарына — чалавек-легенда” раскрыюць веліч асобы беларускага асветніка.

У той жа дзень у Рагачове ўрачыста адкрываўся Дом кнігі, у дар Рагачоўскай цэнтральнай раённай бібліятэцы дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі перадаў шматтомнае факсімільнае выданне “Кніжная спадчына Францыска Скарыны”. Як вядома, агульнанацыянальны праект па перавыданні кніг першадрукара разлічаны на 2013-17 гады і прымеркаваны да будучага юбілею. Камплекты кніг выходзяць у свет — і перадаюцца ў дар бібліятэкам, музеям і архівам Беларусі ды іншых краін.

Нацыянальная бібліятэка разгарнула ў Рагачоўскай ЦРБ (Доме кнігі) экспазіцыяю “500 гадоў беларускага кнігадрукавання”. Госці свята змаглі ўбачыць узоры беларускага кнігадрукавання XVII—XX стагоддзяў. А на дзіцячай пляцоўцы Фестывалю кнігі і прэсы НББ прадставіла жыхарам і гасцям горада пазнавальна-забаўляльную праграму “Пазітыў ад Скарыны”.